ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (803) ● Чацвер, 4 сакавіка 1971 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

*Для гэтых дзяўчат заканчваецца апошні год вучобы ва універсітэце. Хутка пяцікурсніцы фізічнага факультэта Людміла Аўсянская і Валянціна Кавалеўская станучь настаўніцамі.*

*НА ЗДЫМКУ: Л. Аўсянская (злева) і В. Кавалеўская ў лабараторыі методыкі выкладання фізікі.*

*Фота Г. МАРОЗАВА.*



## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ПРАКТЫКА

Сёння ў зале пасяджэнняў вучонага савета адкрываецца навукова-метадычная канферэнцыя па абагульненню вопыту вытворчай, вучэбнай і педагагічнай практыкі студэнтаў. У яе рабоце прымуць актыўны ўдзел і выступяць з дакладамі 76 чалавек, у тым ліку 4 акадэмікі і члены-карэспандэнты АН СССР і БССР, 14 прафесараў, 38 дацэнтаў, прадстаўнікі прадпрыемстваў і школ рэспублікі.

На пленарным пасяджэнні з дакладам «Аб стане і мерах паляпшэння арганізацыі і правядзення вытворчай і педагагічнай практыкі студэнтаў» выступіць прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АПН СССР С. А. Умрэйка.

Палітыка-выхаваўчай рабоце студэнтаў у перыяд практыкі прысвеціць сваё выступленне сакратар парткома БДУ дацэнт М. К. Гарбачоў.

Заўтра пачнуць работу секцыі: фізічная, хімічная, прыкладной матэматыкі, геаграфічная, біялагічная, матэматычная, журналістыкі, філалагічная, гістарычная.

## НЕ З ПУСТЫМІ РУКАМІ

З асаблівым нецярпеннем мы чакалі зімовую экзаменацыйную сесію. Яна павінна была даць адказ на цэлы шэраг хвалюючых пытанняў.

Факультэт наш яшчэ зусім малады, і экзаменацыйная праверка павінна была паказаць, наколькі добра падрыхтаваны студэнты, наколькі апраўдваюцца ўскладзеныя на нас надзеі. Увогуле сесію чакалі ўсе: выкладчыкі, студэнты і, вядома ж, наш камітэт камсамола. Яшчэ задоўга да яе пачатку пытанне аб здачы экзаменаў было самым галоўным на ўсіх пасяджэннях камітэта камсамола, акадэмічнай камісіі, у групах.

Асаблівую трывогу выклікалі першакурснікі. Са свайго вопыту мы ведалі, як цяжка адразу пасля школьнай парты пераключыцца на самастойную работу, як складана ўвайсці ў каляіну студэнцкага жыцця. І мы ўсе намаганні аддавалі таму, каб неяк дапамагчы першакурснікам.

Нарэшце ўсе хваляванні, бяссонныя ночы, страх перад надыходзячым экзаменам засталіся ззаду. Час падвесці вынікі.

З 552 студэнтаў нашага факультэта 115 здалі на выдатна, 160 — на добра і выдатна, на добра і здавальняюча—224.

Парадавалі нас і першакурснікі. 25 з іх здалі на выдатна, 52 — на выдатна і добра, 70 — на добра і здавальняюча. Сярэдні бал па І курсу вышэй, чым прыняты імі ў сацыялістычных абавязацельствах.

Першакурснікі не заставаліся раўнадушнымі да аднэй адзнакі. Яны радаваліся, калі таварыш атрымліваў пяцёрку, дапамагалі, калі што-небудзь не ладзілася. З першага дня адчувалася адказнасць кожнага не толькі за сябе, але і за таварышаў.

Трэба таксама адзначыць, што першакурснікі не толькі добра здалі сесію, але і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэта. З гэтага можна зрабіць вывад аб тым, што рабяты добра ўмеюць сумяшчаць вучобу з грамадскай работай, свае асабістыя інтарэсы з інтарэсамі групы, курса, факультэта.

Кожная група прымала сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы XXIV з'езда КПСС. Асноўным пунктам было пытанне аб паспяховасці. Цяпер ёсць усе падставы гаварыць, што свае абавязацельствы па вучобе студэнты нашага факультэта выканалі з гонарам.

Пасля сесіі былі падведзены вынікі спаборніцтва на лепшую групу па паспяховасці. Першае месца заняла 4-я група III курса. Сярод студэнтаў тут няма ніводнага запазычніка. Сярэдні бал — 4,3. На другім месцы — 3-я група IV курса з сярэднім балам 4,25, і толькі трохі ўступіла ёй першая група першага курса, занятую трэцяе месца. У іх сярэдні бал — 4.22.

Прыемна газарыць аб поспехах, але нельга змоўчаць аб няўдачах. Адразу пасля сесіі студэнты, якія мелі запазычанасць, складалі 9,5 працэнта. Цяпер іх колькасць панізілася да 2 працэнтаў. Аднак каб дабіцца максімальнай паспяховасці, трэба прыкласці яшчэ нямала намаганняў. Многае павінны зрабіць як камітэт камсамола, так і самі студэнты.

Прыемна ўсведамляць, пасляхова здаўшы сесію, што, як і ўвесь савецкі народ, наш факультэт ідзе да XXIV з'езда Камуністычнай партыі не з пустымі рукамі. Мы ганарымся тым, што ленінскі запавет «вучыцца, вучыцца, вучыцца...» выконваецца з гонарам.

**А. ВАСІЛЕЎСКАЯ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола ФПМ.**

## ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ПАВЕДАМЛЯЕ

**10 сакавіка ў камітэце камсамола БДУ (207-ы пакой галоўнага корпуса) праводзіцца «Дзень камандзіра». На пасяджэнні павінны абавязкова прысутнічаць начальнікі штабаў працоўных спраў факультэтаў і камандзіры лінейных будаўнічых атрадаў, што будуць працаваць у Беларусі. Камандзіры павінны мець пры сабе спісы байцоў атрадаў.**

***

**Да ведама сакратароў камсамольскіх арганізацый, начальнікаў штабаў працоўных спраў факультэтаў і камандзіраў лінейных беларускіх атрадаў: дагаворная кампанія павінна быць завершана да 6 сакавіка. Заключаныя дагаворы на правядзенне будаўнічых і іншых работ неабходна неадкладна здаць у штаб працоўных спраў універсітэта.**

***

**Штаб працоўных спраў універсітэта фарміруе атрад з ліку студэнтаў (пераважна дзяўчат) для работы ў летні перыяд у Мінскім рэзерве прадпраўніцтва Беларускай чыгункі.**

**Заявы прымаюцца штабамі працоўных спраў факультэтаў да 15 сакавіка. З умовамі працы можна азнаёміцца штодзённа з 13 гадзін 40 мінут у камітэце камсамола універсітэта.**



*Што жанчыны — вялікая сіла, даказваць не прыходзіцца. Завочны факультэт, напрыклад, прама скажам, трымаецца на жаночых плячах. Мяркуйце самі: дэкан — жанчына, сярод метадыстаў — ніводнага мужчыны.*

*Вось і ў аб'ектыве — толькі жанчыны: метадысты завочнага факультэта (злева направа) В. А. Калекан, Т. А. Шафаронак, Г. А. Дунаева, Т. Р. Кадхута.*

**Працаўніцам універсітэта прысвячаецца 3-я старонка сённяшняга нумара газеты.**

Насустрач XXIV з'езду КПСС

## ПОСПЕХ ПРАЦЫ — У АКТЫЎНАСЦІ КОЖНАГА

**Амаль на ўсіх факультэтах БДУ адбыліся партыйныя сходы, прысвечаныя абмеркаванню праекта Дырэктыў XXIV з'езда КПСС на новае пяцігоддзе. Гісторыкі і матэматыкі, фізікі і журналісты, географы, хімікі, філолагі сканцэнтравалі ўвагу на асноўных выніках развіцця народнай гаспадаркі і задачах, якія неабходна вырашаць на новым этапе камуністычнага будаўніцтва.**

**На фізічным факультэце з дакладам «Праект Дырэктыў XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гг.» выступіў прарэктар БДУ па навуковай рабоце прафесар Л. В. Валадзько.**

**Гаворачы аб выніках прайшоўшай пяцігодкі, Л. В. Валадзько адзначыў, як калектыў універсітэта выконваў ускладзеныя на яго задачы. Так, у мінулым пяцігоддзі навучанне ва універсітэце прайшлі 9.032 чалавекі. Уведзена падрыхтоўка кадраў па раду новых спецыяльнасцей і спецыялізацый, такіх, як прыкладная матэматыка, цеплафізіка, хімія паўправаднікоў, хімія нафты, тэорыя і практыка радыёвяшчання і тэлебачання і іншых. Вучоныя універсітэта выканалі даследаванні па 831 тэме. Пашырыліся і ўмацаваліся сувязі з вытворчасцю і г. д.**

**Падкрэсліўшы задачу істотнага павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці за кошт росту прадукцыйнасці працы, дакладчык звязвае яе з неабходнасцю ўсямерна павышаць эфектыўнасць навуковых даследаванняў. Вучоныя універсітэта павінны канцэнтраваць свае сілы на правядзенні найбольш актуальных, фундаментальных даследаванняў, скарачаць тэрміны іх выканання, паскараць укараненне навуковых распрацовак.**

**Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на паляпшэнне навучальнага працэсу і працы студэнтаў. Гэтая работа павінна ісці па лініі ўдасканалення методыкі навучання, перагляду вучэбных планаў, выкарыстання тэхнічных сродкаў.**

**Дакладчык зрабіў некалькі крытычных заўваг. Яны датычацца метадычнай работы кафедр фізфака. Адзначана, што лабараторныя заняткі на малодшых курсах не нацэлены на развіццё творчай актыўнасці студэнтаў. За апошнія пяць год выкладчыкі факультэта напісалі толькі адзін падручнік і тры вучэбных дапаможнікі, у той час як патрэба ў вучэбнай літаратуры для студэнтаў-фізікаў вельмі вострая. Савет факультэта не кантралюе планаванне і выкананне навукова-даследчай работы кафедр. Патрабуе актывізацыі і навукова-даследчая работа студэнтаў. Яе трэба разглядаць як абавязковы элемент падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.**

**Сход камуністаў фізічнага факультэта адобрыў праект Дырэктыў XXIV з'езда КПСС. Партыйнаму бюро прапанавана арганізаваць абмеркаванне праекта Дырэктыў у вучэбных групах, на кафедрах і ў лабараторыях.**

**Вырашана дагучыць партыйнаму бюро разам з дэканатам і кафедрамі распрацаваць план мерапрыемстваў па павышэнню якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў і эфектыўнасці навуковых даследаванняў на 1971—1975 гг.**

**А. АЛЕНІЧ.**



**На здымку:** семінарскія заняткі па марксісцка-ленінскай філасофіі на другім курсе хімфака вядзе **І. І. Шаціла.**

Фота **Д. Чаховіча.**

## СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМІ

*У памяшканні Саюза пісьменнікаў БССР адбылася сустрэча беларускіх паэтаў і пісьменнікаў з замежнымі студэнтамі, што вучацца ў вышэйшых навучальных установах Мінска. Яе адкрыў сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Мележ, які коратка ахарактарызаваў дасягненні майстроў слова, расказаў аб іх творчых планах, пазнаёміў студэнтаў з некаторымі аўтарамі вядомых твораў.*

*Перад студэнтамі з чытаннем сваіх вершаў выступілі Кастусь Кірэенка, Алесь Бачыла, Адам Русак, Алесь Ставер, Браніслаў Спрынчан. Цікавымі былі выступленні пісьменніцы Алены Васілевіч, беларускага перакладчыка Язэпа Семяжона, пісьменнікаў Аляксея Кулакоўскага, Міколы Ткачова і Мікалая Аляксеева.*

*На сустрэчы па просьбе беларускіх паэтаў і пісьменнікаў з чытаннем сваіх вершаў на в'етнамскай мове выступіў студэнт БДУ в'етнамец Бай Н'ят Хонг.*

*З сардэчнымі словамі падзякі да беларускіх паэтаў і пісьменнікаў звярнуліся студэнты БДУ в'етнамец Нгуен В'ет Хіен, француженка Жані Маганьёск, студэнты політэхнічнага інстытута венгр Немет Мартон і Манфрэд Цайс (ГДР).*

*Г. УЛАДЗІМІРАЎ.*

# ПРАЦЯГВАЕЦЦА АГЛЯД-КОНКУРС

## НА ЛЕПШЫ СТУДЭНЦКІ ІНТЭРНАТ, ПАКОЙ, А ТАКСАМА ФАКУЛЬТЭТ ПА АРГАНІЗАЦЫІ БЫТУ І АДПАЧЫНКУ Ў ІНТЭРНАТАХ

### I. МЭТА І ЗАДАЧЫ

**Агляд-конкурс праводзіцца ў азнаменаванне XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя БДУ і прадугледжвае:**

**1) удзел студэнцкіх інтэрнатаў БДУ імя У. І. Леніна ва Усесаюзным аглядзе-конкурсе;**

**2) актыўную палітыка-выхаваўчую работу студсаветаў інтэрнатаў, прафбюро факультэтаў і прафгруп;**

**3) паляпшэнне санітарнага стану пакояў і бытавых памяшканняў у інтэрнатах;**

**4) паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў студэнтаў, што жывуць у інтэрнатах, і сістэмы самаабслугоўвання;**

**5) выхаванне ў студэнтаў беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці;**

**6) паляпшэнне работы жыллёва-бытавых камісій прафбюро, сектараў камітэтаў камсамола факультэтаў;**

**7) арганізацыю актыўнага адпачынку;**

**8) развіццё ў студэнтаў ініцыятывы і самастойнасці, выхаванне адказнасці за даручаную справу, калектывізму, высокай культуры паводзін.**

### II. АРГАНІЗАЦЫЯ

**Агляд-конкурс праводзіцца рэктаратам, прафкомам, камітэтам камсамола і грамадскім студсаветам універсітэта з 7 лістапада 1970 года па 30 кастрычніка 1971 года ў два этапы:**

**першы этап — з 7 лістапада 1970 года па 30 сакавіка 1971 года;**

**другі этап — з 31 сакавіка па 30 кастрычніка 1971 года.**

**Адказнасць за выкананне умоў агляду-конкурсу ўскладаецца на дэканаў факультэтаў, камендантаў інтэрнатаў, студэнцкія саветы інтэрнатаў, прафбюро і камітэты камсамола факультэтаў, стараст пакояў.**

### III. УМОВЫ

**Пераможцы вызначаюцца асобна сярод:**

**студэнцкіх інтэрнатаў універсітэта**

**факультэтаў універсітэта**

**пакояў кожнага інтэрната.**

**Пераможцам агляду-конкурсу лічыцца той інтэрнат, які выканаў наступныя ўмовы:**

#### 1) РАБОТА СТУДСАВЕТА ІНТЭРНАТА

**Савет студэнцкага інтэрната аказвае дапамогу адміністрацыі і грамадскім арганізацыям у выхаваўчай, культурна-масавай і спартыўна-аздараўленчай рабоце, садзейнічае паляпшэнню бытавога абслугоўвання студэнтаў. Ёсць планы работ камісій, справаздачы аб праведзеных мерапрыемствах па выхаванню ў студэнтаў беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці, па навядзенню ўзорнага парадку ў інтэрнатах, арганізацыі самаабслугоўвання, аб культурна-масавай і спартыўна-аздараўленчай рабоце. Студсавет з'яўляецца арганізатарам усіх мерапрыемстваў.**

**А ц э н к а 20 балаў.**

#### 2) ЛЕНІНСКІ ПАКОЙ І ЧЫТАЛЬНАЯ ЗАЛА

**Ленінскі пакой афармлен стэндамі, прысвечанымі У. І. Леніну, камсамолу, XXIV з'езду КПСС і 50-годдзю БДУ і г. д., якія расказваюць аб жыцці, вучобе і быце студэнтаў. Ёсць тэлевізар, бібліятэчка. У чытальнай зале створаны спрыяльныя ўмовы для заняткаў студэнтаў. У інтэрнаце рэгулярна працуе радыёвузел, ёсць падшыўкі газет. Савет ленінскага пакоя арганізуе канферэнцыі чытачоў, шахматныя і шашачныя турніры, конкурсы знаўцаў па розных відах навукі, тэхнікі, культуры і спорту. У інтэрнаце працуе фоталабараторыя. Арганізуюцца тэматычныя конкурсы, фотавыстаўкі работ студэнтаў, рэгулярна выпускаюцца насценгазеты і сатырычныя лісткі. У ленпакоі і чытальнай зале добрае абсталяванне.**

**А ц э н к а 20 балаў.**

#### 3) УТРЫМАННЕ І САНІТАРНЫ СТАН ЖЫЛЫХ ПАМЯШКАННЯЎ

**У жылым пакоі павінна быць неабходная мэбля, якая ўтрымліваецца ва ўзорным парадку і чысціні. Ложкі акуратна засланы. Асабістыя рэчы — на сваім месцы. Пакой павінен быць утульным. Курыць дазваляецца толькі ў адведзеных для гэтага месцах.**

**А ц э н к а 10 балаў.**

#### 4) БЫТАВЫЯ ПАМЯШКАННІ

**Кожны інтэрнат павінен мець абсталяваныя па тыпавых нормах сталовыя або буфеты, кухні, бытавыя памяшканні, умывальнікі, душавыя, санпункты, пральні, сушылкі, абсталяваныя месцы для чысткі абутку.**

**У інтэрнаце строга падтрымліваецца пропускны рэжым. Вестыбюль афармлен нагляднай агітацыяй. Тут павінны быць кветкі, крэслы, часопісныя сталы, тэлефон і г. д.**

**А ц э н к а 20 балаў.**

#### 5) ПУНКТЫ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ

**Сталовыя або буфеты добра абсталяваны, адпавядаюць санітарна-гігіенічным патрабаванням. Якасць прыгатавання стравы павінна быць добрай [па актах камісій грамадскага кантролю], асартымент—разнастайным, культура абслугоўвання — высокай.**

**А ц э н к а 20 балаў.**

**Пераможцам агляду-конкурсу на лепшы факультэт па арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў лічыцца той факультэт, які выканаў наступныя ўмовы агляду-конкурсу:**

#### РАБОТА КАМІСІЙ ПРАФБЮРО І СЕКТАРАЎ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА ФАКУЛЬТЭТАЎ

**Прафбюро і камітэты камсамола факультэтаў вядуць у інтэрнатах выхаваўчую, культурна-масавую, спартыўна-аздараўленчую работу, накіраваную на паляпшэнне паводзін студэнтаў, на захаванне сацыялістычнай маёмасці, на паляпшэнне бытавых умоў, арганізацыі самаабслугоўвання ў інтэрнатах.**

### IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

**Для падвядзення вынікаў агляду-конкурсу загадам рэктара ствараецца камісія з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і кіраўніцтва універсітэта, якая падводзіць вынікі па кожнаму этапу. Пераможцамі могуць стаць тыя інтэрнаты і факультэты, якія набяруць найбольшую колькасць ачкоў. Пры вызначэнні месц за два этапы ачкі, набраныя на першым і другім этапах, складваюцца.**

**Вынікі на лепшы пакой інтэрната штомесячна падводзіць студсавет інтэрната і даныя прадстаўляе ў прафком. Пры роўных выніках перавага аддаецца таму пакою, які знаходзіцца на лепшым паверсе [маецца на ўвазе санітарны стан].**

### V. УЗНАГАРОДЖАННЕ

**1. Пераможцы агляду-конкурсу інтэрнатаў на кожным этапе ўзнагароджваюцца за першае месца Ганаровымі граматамі прафкома, за другое і трэцяе месцы — граматамі. Студсаветы і абслугоўваючы персанал, чые інтэрнаты занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца грашовымі прэміямі.**

**2. Граматамі і грашовымі прэміямі ўзнагароджваюцца і пераможцы конкурсу сярод факультэтаў па арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў.**

**3. Лепшыя пакоі па выніках кожнага месяца адзначаюцца студсаветамі пераходнымі вымпеламі і прызамі. Жыхары гэтых пакояў па выніках года ўзнагароджваюцца граматамі грамадскіх арганізацый універсітэта, а таксама пуцёўкамі ў дамы адпачынку.**

*ДА 50-ГОДДЗЯ УНІВЕРСІТЭТА*

# ПЯТРУСЬ БРОЎКА— СТУДЭНТ БДУ

Пятрусь Броўка прыйшоў у літаратуру ў сярэдзіне 20-х гадоў. Яго першыя вершы з 1926 года змяшчаюцца на старонках «Чырвонай Полаччыны» і літаратурнага альманаха «Наддзвінне».

У 1928 г. Пятрусь Броўка прыязджае ў Мінск і паступае ў Беларускі дзяржаўны універсітэт на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака. Было яму тады толькі 23 гады, але за плячыма — вялікі жыццёвы вопыт. Працаваць давялося з 13 год на самых розных пасадах: перапісчыкам, рахункаводам, страхавым агентам, старшынёй сельсавета. Працаваў у акружкоме камсамола, у рэдакцыі газеты. У 1928 годзе Броўка быў ужо даволі вядомым паэтам.

Літаратурнае жыццё Беларусі ў 20-я гады было багатым і разнастайным, але таксама і складаным. У тым жа 1928 годзе група маладых пісьменнікаў (у тым ліку і Броўка) выходзіць з «Маладняка» і ўтварае аб'яднанне «Літаратурна-мастацкая камуна». Аб'яднанне выпусціла два нумары свайго часопіса «Росквіт».

«Літаратурна - мастацкая камуна» ўзнікла, безумоўна, пад уплывам Лефу. На творчасць Броўкі таго часу вялікі ўплыў зрабілі вершы Маякоўскага. Але гэта было не перайманне паэтычнага метаду, а успрыняцце і творчае асэнсаванне лепшых традыцый выдатнага савецкага паэта:

Дайце
  Новую музыку!
  Новыя струны!
  І мелодыі дзіўныя дайце!
Я хачу:
  каб замест паніхіды
      хаўтурнай
  новы марш—
Беларусі іграць.
Я хачу:
  песні новыя скласці,
  у словах шчасця забыўшы
      пра гора.
Я хачу:
  на трактар ускласці
  і на вёску
  ўзвесці горад.

«Літаратурна - мастацкая камуна» праіснавала некалькі месяцаў: пасля выхаду ў свет другога нумара «Росквіту» аб'яднанне аб'явіла аб самаліквідаванні. Гэта было абумоўлена тым, што аб'яднанне не несла нічога прынцыпова новага.

Літаратурная дзейнасць Броўкі універсітэцкага перыяду была даволі плённай. «У гады першай пяцігодкі,—успамінае Пётр Усцінавіч,—мы пісалі пра ўсё. Хадзілі на заводы, чыталі, бічавалі прагульшчыкаў, гультаёў, рвачоў. Часта выходзіла рытарычна. Што ж, многае стала аднадзёнкай, але я ніколі не шкадаваў працы, адданай лозунгам і агіткам. Працуючы над імі, даводзілася быць у віры жыцця і многае пазнаць».

У 1930 годзе выходзяць першыя кніжкі Броўкі—«Гады, як шторм» і «Прамова фактамі».

Паэма «Прамова фактамі», напісаная да дзесяцігоддзя вызвалення Беларусі ад белапалякаў,—значная ўдача паэта. Ён піша аб новым жыцці Савецкай Беларусі, аб подзвігах яе народа, смуткуе аб лёсе Заходняй Беларусі:

Беларусь
      савецкай стала,
Загудзеў
      рабочы гоман.
Толькі многа
      ў сэрцы жалю,
Што не ўся
      краіна дома.

Паэт упэўнен, што ў хуткім часе Беларусь будзе святкаваць сваё аб'яднанне:

Кліча дух бунтоўскі
      ўперад,
Йдуць КПЗБ калоны,
Скора час!
      Над Бельведэрам
Загарыцца сцяг чырвоны.

Багатым было літаратурнае жыццё універсітэта. Маладыя пісьменнікі выступалі ў рабочых клубах, на заводах, фабрыках, друкаваліся ва універсітэцкіх і рэспубліканскіх выданнях. П. Броўка рэдагаваў насценгазету педфака «Кузня асветы».

Ва універсітэце наладжваліся літаратурныя вечары і дыспуты, на якіх выступалі і вядомыя, і пачынаючыя пісьменнікі. Пятрусь Броўка прымаў удзел ва ўсіх такіх вечарах. Яго першыя кнігі мелі поспех, аб іх спрачаліся ў рэспубліканскім друку. Імя паэта было вядома шырокаму колу чытачоў. Яго вершы гучалі на літаратурных вечарах, у школах, клубах.

У 1930 годзе ў саставе пісьменніцкай агітбрыгады (дарэчы, у ёй быў і вядомы рускі паэт Б. Карнілаў) Броўка едзе ў Добруш на папяровую фабрыку. Вынік гэтай паездкі—зборнік вершаў «Цэхавыя будні» і аповесць «Каландры».

У тыя гады рабочая тэматыка была ў беларускай літаратуры амаль не распрацавана і прыцягвала ўвагу многіх пісьменнікаў. У «Полымі» змешчан «Ліст да аўтара «Цэхавых будняў» Б. Мікуліча і С. Ліхадзіеўскага. Звярнуўшы ўвагу на некаторыя недахопы зборніка, аўтары адзначаюць, што «кніжка («Цэхавыя будні») дужа актуальная, калі не сказаць больш—злабадзённая».

І «Каландры», і «Цэхавыя будні» выйшлі адразу пасля заканчэння Броўкам універсітэта, але яны былі напісаны яшчэ ў студэнцкія гады і таму маюць для нас непасрэдную цікавасць.

Аповесць «Каландры» прасякнута каларытам тых дзён, працоўнай натхнёнасцю. Невялічкая аповесць дае даволі шырокую карціну тагачаснага жыцця ў горадзе і барацьбы за новае ў вёсцы. Шмат старонак аповесці прысвечана калектывізацыі, станаўленню новага ладу на вёсцы.

Аповесць «Каландры»—першы празаічны твор Броўкі, і трэба сказаць, удалы твор. Аповесць некалькі разоў выходзіла да вайны асобным выданнем, яна змешчана ў чатырохтомніку П. Броўкі, па ёй у 1934 годзе быў пастаўлен кінафільм.

Імя П. Броўкі, яго творчасць бясконца дарагія для Беларусі. Народны паэт, грамадскі дзеяч, лаўрэат Ленінскай прэміі, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, лаўрэат літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа, член ЦК КПБ—такі Пётр Усцінавіч Броўка. І таму так цікава нам, студэнтам БДУ, ведаць пра студэнцкія гады паэта.

Пятрусь Броўка скончыў універсітэт у 1931 годзе. У аўтабіяграфіі, змешчанай у зборніку «54 дарогі», пісьменнік прызнаецца: «Вучоба ва універсітэце, творчае таварыскае асяроддзе шмат садзейнічала майму літаратурнаму станаўленню». І гэта сапраўды так.

**С. ПАЛІТЫКА,**
**студэнт II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

# У ДОБРЫ ЧАС!..

**Паліна Харэвіч, Валянціна Гіруць—студэнткі першага курса. Паліна—беларускага аддзялення філфака, Валя—журфака. Гэта іх першае выступленне на старонках нашай газеты, іх пасвячэнне ва ўзлётаўцы. Дэбют іх прыходзіцца на пярэдадзень 8 Сакавіка і не можа не быць добрым днём для пачынаючых паэтэс. Тым больш, што вершы нашых абаіх дэбютантак выдаюць у кожнай з іх прыроджаную паэтычную жывінку. Дык—у добры час!**

**Алег ЛОЙКА, кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».**

Паліна ХАРЭВІЧ.

## ПЕРАД СВІТАННЕМ

Заціхнула ўсё ў салодкім сне.
Русалкай ноч брыдзе па краю.
Але чаму не спіцца мне,
Да сэрца смутак падступае?

Як цяжка, цяжка мне заснуць!..
Там, дзе высокія курганы,
Салдаты на ўвесь рост устаюць,
А вецер ім бінтуе раны.

Яны спяшаюцца дамоў,
Дзе ў снах чакаюць іх матулі,
Сказаць ім колькі цёплых слоў,
Што абарвалі калісь кулі.

## ЗІМОВАЕ

Застыў здранцвелы лес,
Як перад стартам,
Сагнулася сасна
У чаканні сінім.
А зграбныя бярозкі,
Нібы жартам,
Каленцы прызакрылі
Белым інеем.
І цішыня...
Напружаная, дзіўная, —
Баюся крок ступіць,
Каб не парушыць.
Глядзяць бярозкі
Зорачкамі інею
На мой застылы твар,
На нерашучасць.

## ВЕРА



Вераць вёснам пралескі,
Калі тыя шапочуць:
«Вам блакіт зноў падораць
Пацалункі праменняў».

Каня верыць нястомна,
Што грамы загрукочуць,
І напояць яе
Дажджавыя струмені.

Веру я: за расстаннем
Будзе смага сустрэчы,
Зоркі будуць на шчасце,
Як арэхі, нам падаць.

І туга тады здасца
Такой недарэчнай,
Зацвіце ў пацалунку
Дрыготкая радасць.

Валянціна ГІРУЦЬ.



* * *

Лёгкі пах духмянага чабору,
Разагрэтага пад сонцам летнім,
І хваёвы водар каля бору
Аж дурманяць цёплае паветра.
Поўдзень. І гарачыня такая,
Нават дрэвы ля ракі ў знямозе.
Ціхі ветрык зрэдку павявае,
Толькі прахалоды не прыносіць,
Духата. Ды вось неспадзявана
Хмарка, што блукала без
прытулку,
Раптам хлесянула, нібы з чана.
Дождж буйны—ад спёкі
паратункам,
Дыхаць стала хораша і лёгка.
Асвяжылася запыленае лісце.
Кропелькі дажджу прыгожа,
дрогка
На вясёлцы радасна павіслі.

## ХОДЗІЦЬ НОЧ

Ноч ахутвае шаўковай шырмай
Ціхія і сонныя прасторы,
Разлівае шэры змрок усё
шырай,
Зноў запальвае мільярды
зорак.
А яны рассыпаліся ў небе
Светлячкамі у бяздонні
чорным.
Толькі ўважліва паслухаць
трэба:
Усе яны чароўных гукаў
поўны...
Лёгка ходзіць ноч нячутным
крокам,
Ціха песню сонную спявае.
Зморанае днём усё навокал
Светлым сном спакойна
засынае.

# ПРЫЕМНА І ЦІКАВА

У канцы чэрвеня 1970 года я закончыў Парыжскі інстытут электронікі, а цяпер праходжу стажыроўку ва універсітэце па прыкладной матэматыцы. Мінулым летам у саставе групы французскіх і англійскіх студэнтаў я вывучаў рускую мову пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Мінскага дзяржаўнага інстытута замежных моў і ўжо тады адчуў клопаты і ўвагу савецкіх людзей.

А нядаўна мне давялося яшчэ раз пераканацца ў гасціннасці беларускіх сяброў. Дэканат па навучанню замежных студэнтаў арганізаваў цікавую паездку ў Ленінград. У групу ўваходзілі 20 в'етнамскіх студэнтаў і я, узначальваў яе старшы інспектар дэканата С. Е. Запатрын.

Надвор'е ў Ленінградзе вельмі нагадвала французскую зіму, і таму наведанне гэтага горада праходзіла ў прыемных умовах. У першы дзень мы пабывалі ў Эрмітажы, які па багаццю можна параўнаць з парыжскім Луўрам і лонданскай Тайм-галерэяй. На наступны дзень ездзілі ў Разліў. Нельга без хвалявання ўспамінаць аб гэтым гістарычным месцы, так цесна звязаным з дарагім сэрцу ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва імем У. І. Леніна.

З вялікай цікавасцю мы наведалі Рускі музей і Ісакіеўскі сабор.

Ленінград — гэта не толькі помнікі, але і метро, і Неўскі праспект (ад якога вельмі нагадвае парыжскія вуліцы) з яго магазінамі, рэкламамі, аўтамабільным рухам і мноствам турыстаў.

Нашы гіды С. Е. Запатрын і Г. А. Берзінь арганізавалі наведанне самадзейнага тэатра, канцэрта народнай музыкі і тэатра камедыі.

Трэба сказаць, што работнікі дэканата па навучанню замежных студэнтаў робяць усё, каб наша стажыроўка была карыснай і цікавай.

Далідон Т'ЕРЫ (Францыя),
стажор факультэта прыкладной матэматыкі.

# ПА ГРАЗІ І СНЕЗЕ

*Варта было адысці ад агню ў глыб лесу, як заціхлі галасы рабят і звон гітары. Марозная, хрусткая цішыня. Месяц, чапляючыся за ёлкі, выкаціўся з-за далёкага ўзгорка. Вершаліны дрэў сталі блакітнымі. Матава адсвечваў снег. Ля падножжа ўзгорка серабрылася ў месячным тумане белае поле Блакітнага возера. Ноччу яно не менш прыгожае, чым днём, і нават больш казачнае.*

*Успомніўся мінулы дзень. На Блакітныя азёры мы прыйшлі раніцай. Усяго азёр тры. Яны невялікія: усе можна аббегаць за гадзіны дзве. Утульна размясціўшыся паміж узгоркамі, зарослымі соснамі і ёлкамі, яны вабяць сваёй прыгажосцю.*

*Раніцай, калі сонца яшчэ нізка, блакітныя цені ад лесу, чаргуючыся з палосамі барвовага снегу, дабягаюць амаль да сярэдзіны азёр.*

*Я вяртаюся да кастра. Арцём перабірае струны гітары і разам з Сашам спявае песню аб дарогах і марах. Астатнія слухаюць, задуменна гледзячы на дрыготкае полымя. Гэта быў наш апошні паходны касцёр. Ужо заўтра рана мы павінны вярнуцца ў Мінск. Трэба было зрабіць апошнія запісы ў дзённіку. Я падсеў да агню, перагарнуў запісную кніжку.*

*Першы запіс: «Маршрут Лагойск — Вілейка — Нарач — Блакітныя азёры. Тэрмін — 8 дзён. Адлегласць — 160 км. Састаў — 7 чалавек: фізікі, матэматыкі, журналіст. Мэта паходу — адпачыць пасля сесіі, пазнаёміцца з новымі мясцінамі, прачытаць некалькі лекцый аб універсітэце».*

*Захацелася аднавіць у памяці дні паходу.*

*...Не пашанцавала з надвор'ем. Туман такі, што за пяць-дзесяць метраў усё расплываецца. Ён «з'еў» увесь снег. Але лыжы мы ўсё ж узялі. Яны віселі за спінамі, прывязаныя да рукзакоў, і выклікалі ў шафёраў жаданне прытармазіць свае машыны і сказаць што-небудзь з'едлівае, накшталт: «Вы што, у рукзаках снег несяце?» або «Гэй, рабяты, навучыце мяне па гразі на лыжах ездзіць!»*

*Яшчэ не балелі плечы ад рукзакоў, настрой быў цудоўны, таму мы бадзёра хлюпалі па дарожнай гразі, не звяртаючы ўвагі на жарты.*

*А пасля былі і начлегі ў лесе ля кастра, і пераход праз балота, з якога мы выйшлі па пояс закаваныя ў лёд, і бясконцая белізна Нарачы, і сустрэчы, і песні...*

*Апошнія тры дні ішлі ўжо на лыжах па добрым снезе. Адным словам, у апошнюю ноч ніхто не шкадаваў аб прайшоўшым тыдні.*

*Ля кастра спрачаліся аб чым толькі можна было, аж да чатырох гадзін. А пасля пад праменямі ліхтарыкаў задыміўся заваленны снегам наш касцёр. Да бліжэйшага аўтобуснага прыпынку было восем кіламетраў лясной дарогі.*

*А. КУХАРЧУК,*
*студэнт журфака.*



# МОЦНЫЯ, СПРЫТНЫЯ, ХУТКІЯ

Лыжнікі і канькабежцы яшчэ не пакінулі сваіх бегавых дарожак, але зіма ўжо здае свае правы. Не за гарамі лета, а з ім і V Спартакіяда народаў СССР. Зараз у залах усіх спартыўных таварыстваў ідзе напружаная падрыхтоўка да гэтага вялікага свята.

Нядаўна ў спортклуб БДУ прыйшла радасная вестка: 36 студэнтаў нашага універсітэта будуць абараняць гонар Беларускай рэспублікі на V Спартакіядзе народаў СССР.

На лёгкаатлетычныя дарожкі выйдуць студэнтка хімічнага факультэта Бяляева і супрацоўнік гэтага факультэта Бароўскі, студэнт II курса гістфака Глыбоўскі, студэнт II курса фізічнага факультэта Лютарэвіч і іншыя. У спаборніцтвах па настольнаму тэнісу выступіць студэнт II курса фізічнага факультэта Зелянко. У зборную каманду рэспублікі па веласпорту ўвайшоў студэнт II курса журфака Пац.

Р. ВАШУК.

# ЗА ДОШКАМІ—МАЦНЕЙШЫЯ

— І хто гэта вырашыў аддаць лёс сустрэчы ў жаночыя рукі? Цуд — і толькі!

Менавіта такія словы я пачуў пасля чарговага тура па шахматах на першынство універсітэта.

Так, вынік сустрэчы паміж Т. Вашчанка (журфак) і М. Гурынай (юрфак) вырашаў, якая каманда атрымае перамогу.

Гэта была самая драматычная партыя з усіх тых, якія даводзілася назіраць многім шахматыстам. Спачатку ўсё ішло добра: дзяўчаты разыгралі дэбют і хутка ўступілі ў міттэльшпіль. Вось тут гульня і зацягнулася. Ужо тры гадзіны ідзе барацьба на шахматнай дошцы, а вынік ніхто не возьмецца прадказаць. Толькі некаторая перавага Гурынай дае падставу для таго, каб капітан каманды юрфака Смальянаў заявіў: «Перамога будзе за нашай шахматысткай!» Ён нават забыў пра нядаўні пройгрыш В. Купрэйчыку.

З трывогай і адчаем назіралі за пазіцыяй Вашчанкі і журналісты. «Напэўна, Тамара атрымае нуль...», — выказвалі многія сваю думку.

І тут здарылася нечаканае: адзіны няправільны ход Марыі Гурынай — і цікавай камбінацыяй Вашчанка праводзіць сваю пешку ў ферзі. Яе саперніцы нічога не засталося, як павіншаваць Тамару з перамогай.

Каманда журфака перамагла — 4:3.

Пасля сустрэчы Вашчанка сказала: «А ў мяне нервы аказаліся мацнейшымі, таму я і прынесла камандзе ачко».

Падобнае назіраецца амаль кожны дзень. Да апошняга дыхання вядуць барацьбу «рыцары» шахматнай дошкі, бо кожнае ачко і нават паўачка будуць уплываць на месца каманды ў агульным заліку спаборніцтваў.

Пакуль што лепш за ўсіх выступаюць шахматысты факультэтаў матэматычнага, фізічнага і прыкладной матэматыкі.

Спаборніцтвы працягваюцца.

**Ул. СКУЛЬБЕДАЎ,**
**суддзя спаборніцтваў.**

## ПОСПЕХ ВЫПАЎ ГАСЦЯМ

*На мінулым тыдні гасцямі нашага універсітэта былі зборныя каманды па валейболу Каўнаскага політэхнічнага інстытута. Яны ўдзельнічалі ў чатырох сяброўскіх сустрэчах. У першы дзень спаборніцтваў у сустрэчы жаночых каманд выйгралі дзяўчаты БДУ з лікам 3:0, а вось рабяты з лікам 2:3 прайгралі.*

*Наступны дзень прынёс поспех нашым гасцям. І дзяўчаты і хлопцы ў цяжкай барацьбе выйгралі з аднолькавым лікам 3:2.*

*У красавіку-маі каманды нашага універсітэта паедуць у г. Каўнас і правядуць там адказныя сустрэчы з політэхнічным інстытутам. Пабываюць яны і ў г. Вільнюсе, дзе будуць іграць з камандамі горада.*

*Цяпер спартсмены БДУ рыхтуюцца да першынства па валейболу сярод навучальных устаноў Мінска. У спаборніцтвах прымуць удзел першыя і другія зборныя каманды. Спадзяемся, што яны будуць для нашых валейбалістаў больш паспяховымі.*

*Т. АЛЯКСЕЕВА,*
*член зборнай каманды БДУ па валейболу.*

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Тэлефон—22-07-19. Тыраж 2.000 экз. Зак. 300. АТ 08087